**УДК 719(476)**

# ШЛЯХАМІ НАПАЛЕОНА ОРДЫ 1875–1877 гг.

*доктар мастацтвазнаўства, дац. Т.В. ГАБРУСЬ*
*(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)*

*Прадстаўлены гістарычна-мастацтвазнаўчы агляд архітэктурнай спадчыны Падзвіння і Падняпроўя на аснове пейзажаў Напалеона Орды. Для разгляду прыцягнуты малавядомыя арыгінальныя архітэктурныя краявіды Н.Орды гарадоў і мястэчак Верхняга Падняпроўя і Падзвіння, якія з'яўляюцца ўнікальнымі носьбітамі гістарычнай памяці тутэйшых зруйнаваных святыьі.*

На сённяшні дзень па розных крыніцах вядома звыш 1000 арыгінальных аўтарскіх архітэктурных пейзажаў Напалеона Орды, з якіх большая частка знаходзіцца ў зборах Нацыянальнага музея ў Кракаве. Гэта 907 малюнкаў, якія тычацца гісторыка-культурных помнікаў былой Рэчы Паспалітай, і 85 краявідаў іншых краін Еўропы. З каталога гэтага збору [1] намі вылучаны архітэктурныя замалёўкі асобных культавых пабудоў і панарамы мястэчак з шматлікімі святынямі розных канфесій, зробленыя на тэрыторыі Беларусі і гістарычнай Літвы ў межах Гродзенскай, Віленскай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў (паводле сістэматызацыі самога Н. Орды), якіх атрымалася каля 100. Прыблізнасць лічбы абумоўлена зменамі адміністрацыйна-дзяржаўнага падзелу, якія адбыліся ў XX ст.

Архітэктурныя замалёўкі Напалеона Орды звычайна выкананы алоўкам і злегку таніраваныя акварэллю альбо сепіяй. 260 малюнкаў у 1870-х гг. былі пераведзены ў літаграфіі Алаізам Місуровічам і выдадзены ў Варшаве ўласным коштам Орды ў серыі "Гістарычныя віды Польшчы", што ўключае восем альбомаў. Менавіта гэтыя выявы з'яўляюцца найбольш вядомымі і паўтараюцца ў шматлікіх публікацыях. Іх адметнай рысай з'яўляецца наяўнасць у архітэктурным краявідзе фігурак людзей, коней, лодак, якія дамаляваны літографам для ажыўлення, на яго думку, малюнка, але часам яны неадпавядаюць агульнаму маштабу панарамы. Сам Орда рабіў архітэктурныя замалёўкі без персанажаў, захоўваючы пры гэтым дакладны антраметрычны маштаб. Арыгіналы малюнкаў больш лірычныя па настроі, празрыстыя і вытанчаныя, спалучаюць адначасова фатаграфічную аб'ектыўнасць і асаблівасці індывідуальнага мастацкага бачання. Пры выбары натурных аб'ектаў ён адначасова праводзіў пэўную навуковую краязнаўчую працу, іншы раз суправаджаў малюнкі старажытных помнікаў дойлідства разгорнутымі тлумачальнымі надпісамі ў мясцовай лексіцы на лацінцы, дадаткова паўторанымі на французскай мове.

Кожнае лета 1875–1876 гг. Н. Орда бываў на Віцебшчыне, але на шэрагу малюнкаў менавіта гэтага рэгіёна адзначаны толькі дзень. Надпіс на малюнку мястэчка Ула (былы Лепельскі павет, цяпер Бешанковіцкі раён) наступны: "1775 Тэрэза з Сухадольскіх Кашыцава − Ула; Усце Уланкі да Дзвіны − Касцёл на Старым замчышчы і цментары... (неразборліва), на адвароце: "Губ. Віцебская. Ула ў сутоку Уланкі і Дзвіны. Замак абарончы, узведзены пры Іване Грозным, захоплены і знішчаны князем Раманам Сангушкам, Гетманам Польным Літоўскім ў 1568 г. − адноўлены і ўмацаваны Стэфанам Баторыям у 1579 г. − Касцёл парафіяльны, фундаваны Ігнатам Рэутам, стаіць на месцы, абкружанымваламі, дзе калісьці стаяў замак" [1, № 768].

Драўляныя касцёл і кляштар дамініканцаў былі заснаваны ў мястэчку Ула ў 1678 г. (па іншых звестках − 1669) заможным шляхціцам Яўстафіям Лукомскім. Кляштар закрыты ў 1782 г. У 1800 г. па фундацыі І. Рэута на месцы драўлянага змураваны новы парафіяльны касцёл св. Апостала Лукі ў стылі барочнага класіцызму. У 1853−1854 гг. ен быў капітальна перабудаваны мясцовым ксяндзом, у выніку чаго набыў элементы архітэктуры несапраўднай готыкі: востравугольныя завяршэнні вежаў і франтона на галоўным фасадзе і інш. Гэтая святыня адлюстравана на малюнку Н. Орды (мал. 1): трохнававая чатырохчасткован святыня з паўкруглай апсідай прэсбітэрыя. Бакавыя фасады рытмічна падзелены ордэрнымі пілястрамі і вокнамі з паўцыркульнымі завяршэннямі, аздоблены тонкапрафіляванымі карнізамі і ліштвамі. У 1914 г. касцёл быў зноў перабудаваны, цяпер знаходзіцца ў напаўразбураным стане.

Наступным годам Н. Орда таксама наведваў беларускае Паазер'е. 20 чэрвеня 1876 г ім намалявана панарама мястэчка Чашнікі (былы Лепельскі павет, цяпер цэнтр раёна Віцебскай вобласці) [1, № 666]. Малюнак (мал. 2) мае разгорнуты тлумачальны надпіс: "Чашнікі. Касцёл дамініканцаў, рэчка Уланка − Старажытнае замчышча − Вінцэнт Валадковіч жонка Зоф'я Гарцінг", а на адвароце: "Губ. Віцебская. Чашнікі. Тут пабудаваны замак князей Патоцкіх з зямлі ... (неразборліва). З гэтага замку ў 1564 г. выйшаў кн. Мікалай Крыштоф Радзівіл, Гетман Літоўскі, і разбіў пад Іваньскам Маскоўскае войска пад началам кн. Шуйскага, які 23 студзеня загінуў у бітве. − Тут таксама атрымаў перамогу кн. Раман Сангушка, Гетман Польны, калі ўзяў у палон Пятра Галавіна ў 1570 г. − Стэфан Баторый прымаў тут паслоў



polotsk.su

Маскоўскіх у 1580 г., ідучы на Вялікія Лукі. − На замчышчы стаіць касцёл і кляштар айцоў дамініканцаў, пабудаваны Жыгімонтам Слушкам, Харунжым Літоўскім ў 1674 г.” (па іншых крыніцах Адамам Слушкам − *Т. Г.*).



**Малюнак 1 – Ула. Панарама мястэчка з касцёлам дамініканцаў**



**Малюнак 2 – Чашнікі. Панарама мястэчка з касцёлам дамініканцаў**

Відавочна, што ў тлумачальным надпісе да малюнка больш увагі Орда надае слаўнай гісторыі тутэйшага замка, але цікавую інфармацыю прадстаўляе таксама выява комплекса дамініканскага кляштара, які на сённяшні дзень не існуе. Касцёл св. Тамаша Аквінскага − трохнефавая базіліка з трансептам, роўнавысокім з цэнтральным нефам, і фасадам-нартэксам з дзвюма чацверыковымі вежамі, увенчанымі вярхамі, што спалучаюць форму шатра-“каўпака” і гранёнага купалка-“банькі”. Тарцы даха трансепта закрыты сціплымі трохвугольнымі франтонамі. Стылістыка святыні мела выразныя рысы сармацкага барока. За алтарнай часткай касцёла размяшчаўся двухпавярховы П-падобны кляштарны корпус, які пасля скасавання кляштара ў 1832 г. нейкі час выкарыстоўваўся як шпіталь. Справа ад касцёла дамініканцаў на малюнку прадстаўлена драўляная праваслаўная Мікалаеўская царква, якая складалася з чатырох зрубаў, што ўтваралі ў плане роўнаканцавы грэчаскі крыж. Гэтая кампазіцыя драўляных храмаў была вельмі распаўсюджана ў рэгіёне Верхняга Падняпроўя і Падзвіння ў XVII−XVIII стст. Над галоўным уваходам узвышалася трох’ярусная вежа-званіца.

Да паўночна-ўсходняга рэгіёна Беларусі належыць малавядомы малюнак яшчэ аднаго знішчанага на сённяшні дзень дамініканскага комплекса ў Полацку (мал. 3). Кляштар дамініканцаў з драўляным касцёлам Дзевы Марыі быў фундаваны тут у 1672 г. віленскім канонікам Ф.М. Горскім з дазволу віленскага біскупа Аляксандра Сапегі. Толькі ў 1774 г. было пачата ўзвядзенне мураванага касцёла, асноўнае будаўніцтва якога прыпала на 1801−1804 гг. З прычыны панавання ў гэты час ў культавам будаўніцтве Расійскай імперыі ўзораў класіцызму, архітэктура полацкага касцёла дамініканцаў спалучыла рысы позняга барока і класіцызму. Касцёл будаваўся з улікам рэгулярнай класіцыстычнай перапланіроўкі галоўнай плошчы горада, якую праводзіў губернскі архітэктар Іван Зігфрыдан. Гэта была трохнефавая базіліка без трансепта і з бязвежавым галоўным фасадам. Першапачаткова фасад дамініканскага касцёла завяр-

шаўся масіўным фігурным франтонам з арачнымі нішамі, але ў 1804 г. яго замянілі пакатым трохвугольным франтонам на ўсю шырыню збудавання.



**Малюнак 3 – Полацк. Кляштар дамініканцаў**

У адпаведнасці з горадабудаўнічай сітуацыяй касцёл дамініканцаў быў павернуты алтарнай часткай на поўнач, а галоўным паўднёвым фасадам − на галоўную плошчу Полацка. З усходу да яго прылягаў двухпавярховы Г-падобны будынак кляштара, які быў скасаваны, як і ўсе дамініканскія кляштары, у 1832 г. Безгаспадарныя будынкі пацярпелі ад пажараў у 1837 і 1843 гг. Пасля паўстання 1863−1864 гг. храм застаўся адзіным парафіяльным касцёлам Полацка, а ў савецкі час быў закрыты і канчаткова разбураны падчас Вялікай Айчыннай вайны. Калі параўнаць яго фатаграфічную выяву пачатку XX ст. з малюнкам Н. Орды 1875−1876 гг., дзе святыня прадстаўлена буйным планам, уражвае дакладнасць перадачы агульных прапорцый збудавання і архітэктурных дэталяў: авальных люнетаў, ліштваў і нават сухарыкаў на карнізе франтона. Таму нельга не заўважыць розную колькасць калон уваходнага порціка: на малюнку Орды іх чатыры, а на пазнейшым фотаздымку − шэсць. Відавочна, што за гэты час іх прыбудавалі.

Малюнак Н. Орды суправаджаецца надпісам: “Полацк. Касцёл дамініканаў. Тут ляжыць цела св. Баболі урадж. 1591, памёр 1657”. Памянёная асоба нібыта адрасуе нас да больш ранняга малюнка Н. Орды, выкананага 28 мая 1861 г., а прынамсі да яго больш вядомай літаграфіі. Гэта выява драўлянага парафіяльнага касцёла ў мястэчку Янаў Палескі (былы Кобрынскі павет, цяпер цэнтр раёна Брэсцкай вобласці), дзе на першым плане прадстаўлена мураваная чацверыковая капліца ў стылі позняга барока, якая суправаджаецца надпісам: “Помнік св. Баболі”. Андрэй Баболя − слынны каталіцкі місіянер, празваны за красамоўства і пераканаўчасць пропаведзі “апосталам Піншчыны”. Відавочна, што Орду цікавіла гэтая неардынарная асоба. Янаў Палесскі − радзіма Н. Орды і менавіта тут 16 мая 1657 г. Андрэй Баболя быў схоплены і закатаваны атрадам казакоў палкоўніка А. Здановіча. Цела яго было прывезена ў Пінск і пахавана ў крыпце касцёла езуітаў, дзе ў 1702 г. было знойдзена нятленным. У 1808 г. цела А. Баболі было перавезена ў Полацк і, як бачым, захоўвалася ў касцёле дамініканцаў, што адзначыў Н.Орда. Але вандроўка мошчаў святога на гэтым не скончылася. У 1922−1924 гг. яны экспанаваліся ў Маскве, у Музеі медыцыны, затым перавезены ў Рым і змешчаны ў галоўным саборы ордэна езуітаў Іль Джэзу. Кананізаваны каталіцкай царквой 17 красавіка 1938 г. [6].

Святыні дамініканцаў за актыўны ўдзел законнікаў гэтага ордэна ў паўстаннях 1830−1831 і 1863−1864 гг. найбольш пацярпелі ад рэпрэсій улад Расійскай імперыі, а затым канчаткова зруйнаваны ў савецкі час − час паслядоўнага ваяўнічага атэізму. Адной з найбольш прыгожых святыняў гэтага ордэна быў касцёл св. Юр’я ў фальварку Забелы каля вёскі Валынцы (былы Дрысненскі павет, цяпер Верхнядзвінскі раён), аўтарам якога быў славуты віленскі архітэктар І.К. Глаўбіц. У дадзеным выпадку Глаўбіц амаль дакладна паўтарыў у вясковым храме архітэктурныя формы сваіх больш ранніх віленскіх пабудоў, асабліва касцёла бенедыктынак св. Кацярыны, выява якога таксама ёсць у спадчыне Орды (мал. 4) [1, № 815]. На малюнку Н. Орды 1875−1876 гг. з выявай Юр’еўскага касцёла кляштара дамініканцаў, які існаваў тут з 1731 г., наступны надпіс: “Валынцы. Касцёл айцоў дамініканаў фундацыі Рыгора Шчыта”. У будаўнічым кантракце 1749 г., дзе заказчыкам выступаў ксёнз Рэгінальд Ленартовіч, пазначана, што архітэктар павінен “скласці абрыс”, а кіраваць будаўніцтвам абавязваўся майстар Лаўбе. Гэта быў аднанефавы храм зграбных вытанчаных прапорцый у стылі віленскага барока з фігурнымі франтонамі-“дыядэмамі” на тарцах высокага даха. Аб’ёмная пласціна галоўнага фасада выступала за межы нефа дзвюма шмат’яруснымі вежамі тэлескапічнай будовы, узведзенымі ў 1764−1768 гг. Архітэктуры касцёла ўласціва рафініраваная познебарочная пластыка ўваходнай крухты, маляўнічасць абрысаў франтонаў,

валют з грабеньчыкамі, дэкаратыўных вазонаў. Бакавыя алтары выкананы “штукатарам з Вільні”, асвечаны ў 1759 г., а галоўны алтар завершаны і асвечаны толькі ў 1766 г. Аздоба інтэр’ера мела стылістычныя прыкметы ракако.



**Малюнак 4 – Валынцы. Панарама мястэчка з касцёлам дамініканцаў**

Двухпавярховы П-падобны кляштарны корпус, аздоблены рызалітамі з фігурнымі франтонамі, злучаўся з касцёлам пераходнай галерэяй і ствараў з ім адзіны архітэктурна-мастацкі ансамбль, які адкрывала прыгожая барочная брама. Паколькі галоўным напрамкам дзейнасці дамініканцаў была адукацыя, пры ўсіх кляштарах ордэна існавалі школы. У Забелах школа заснавана ў 1716 г. па фундацыі Гільзен-Шадурскіх, пры ёй дзейнічаў школьны тэатр. У 1811 г. школа ператворана ў гімназію (існавала да 1836 г.), якую скончыў беларускі пісьменнік-дэмакрат, адзін з арганізатараў паўстання 1863−1864 гг. на Віцебшчыне А. Вярыга-Дарэўскі. Кляштар скасаваны ў 1857 г. У міжваенны перыяд 2-й Рэчы Паспалітай касцёл дзейнічаў. Ансамбль быў значна пашкоджаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а пасля яе цалкам зруйнаваны.

Акрамя разгледжаных, у полацка-віцебскім рэгіёне дамініканцам належаў яшчэ шэраг цудоўных твораў архітэктуры барока, якія, на жаль, на сённяшні дзень ужо не існуюць і не адлюстраваны на малюнках Н. Орды. Гэта касцёл ва Ушачах, пабудаваны ў 1788−1796 гг. па фундацыі ў 1716 г. ваяводы мінскага Яна Жабы, касцёл у Друі, пабудаваны дамініканцамі да 1767 г. пад кіраўніцтвам Л. Грынцэвіча, касцёл у Посіне (Люцынскі павет, цяпер Латвія), пабудаваны ў 1720−1738 гг., вядомыя па іншых графічных архіўных крыніцах.

Фатальны гістарычны лёс дамініканскіх святынь найбольш яскрава выяўляе каштоўнасць архітэктурных замалёвак Н. Орды як захавальнікаў гістарычнай памяці нашага народа, яго духоўнай культуры. Але не менш пацярпелі і святыні іншых каталіцкіх ордэнаў. Значную ўвагу ў сваіх замалёўках Н. Орда надаў таксама святыням ордэна езуітаў. На малюнку (мал. 5), выкананым 28 чэрвеня 1875−1876 гг. [1, № 564; 7, с.9], касцёл езуітаў у Полацку прадстаўлены надзвычай цёпла і аб’ёмна, у больш выразным ракурсе параўнальна з пазнейшымі фотаздымкамі, з адлюстраваннем мяккай хвалістай пластыкі купала і верхніх ярусаў вежаў у стылі віленскага барока. “Парадная” плошча перад касцёлам прадстаўлена больш падобнай на сядзібны пляц, акружаны дрэвамі.



**Малюнак 5 – Полацк. Касцёл езуітаў**

polotsk.su

Полацк быў першым і апошнім апірышчам езуітаў у Беларусі, духоўным асяродкам дзейнасці гэтага ордэна ў межах Расійскай імперыі, пра што існуе шмат даследаванняў. На працягу паўтара стагоддзя, з 1582 па 1730-я гг., будынкі полацкай місіі езуітаў былі драўлянымі. Мураваны касцёл асвечаны ў гонар Звеставання Дзевы Марыі і св. Стэфана (нябеснага патрона караля-фундатара Стэфана Баторыя) у 1748 г. Мураваны калегіум пачалі ўзводзіць у 1750 г., які разам з касцёлам стварыў велічны архітэктурны ансамбль, агульнай плошчай 7180 м$^2$. Будаўніцтва ажыццяўлялася ўласнымі сіламі, нават купал святыні, тэхнічна найбольш складаную частку збудавання, узводзіў манах Габрыэль Лянкевіч, які атрымаў архітэктурную адукацыю ў Заходняй Еўропе. Архітэктанічна касцёл уяўляў трохнефавую крыжова-купальную базіліку з дзвюхвежавым фасадам у стылі позняга барока. Вышыня вежаў была каля 60 м. Вядома, што на адной з іх месціўся ўнікальны гадзіннік работы віленскага майстра Густава Мудні, хаця, паводле фотаздымку пачатку XX ст., гадзіннікі і званы былі на абедзвюх вежах. Менавіта моцная горадабудаўнічая актыўнасць велічнага культавага збудавання стала прычынай таго, што ў 1936 г. верхнія ярусы вежаў разабралі, а канчаткова святыню зруйнавалі ў 1964 г., падчас халоднай “хрушчоўскай адлігі”, адзначанай ваяўнічым атэізмам.

Выява езуіцкага касцёла св. Францыска Ксаверыя ў Віцебску, на жаль, выканана Н. Ордам толькі эскізна, алоўкам, без падмалёўкі акварэллю (1, № 828), але ў ледзьве чытаемым малюнку (з надпісам на адвароце: “Віцебск. Беларусь”) відавочны тыя ж цяплыня і эстэтычнае захапленне прадстаўленым аб’ектам. Краявід велічнага комплекса касцёла і калегіума ў атачэнні жылой забудовы, зроблены з боку Ратушнай плошчы ад маста праз Віцьбу, які зваўся Езуіцкім. Адтуль адкрывалася эфектная сілуэтная панарама ансамбля, размешчанага на складаным рэльефе. Езуіты з’явіліся ў Віцебску ў 1637 г. У 1640−1644 гг. за кошт смаленскага ваяводы А. Корвін-Гансеўскага быў пабудаваны першы драўляны касцёл, перабудаваны падчас заняцця Віцебска маскоўскім войскам у 1654−1655 гг. у сабор праваслаўнага Аляксееўскага манастыра (у гонар нябеснага патрона маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча), у другой палове XVII ст. вернуты езуітам. У 1708 г. рускія войскі па загаду Пятра І спалілі Віцебск, згарэлі і драўляныя будынкі калегіума езуітаў.

У 1716 г. на сродкі віцебскага кашталяна Марцыяна Агінскага і мясцовай шляхты пачалося ўзвядзенне мураваных будынкаў касцёла і калегіума. Да 1765 г. кіраўніком будоўлі з’яўляўся Базыль Часновіч. Велічная трохнефавая крыжова-купальная базіліка з дзвюхвежавым фасадам была завершана да 1731 г., кансекравана ў 1751 г., пасля завяршэння аздаблення інтэр’ера. Пры калегіуме дзейнічала семінарыя для дзяцей збяднелай шляхты, друкарня, тэатр. Пазней у ім размяшчалася павятовае вучылішча, а з 1822 г. будынак належаў базыльянам да забароны ўніяцтва. У 1843 г. комплекс быў перададзены праваслаўным, а касцёл перайменаваны ў Мікалаеўскі сабор, у гонар нябеснага патрона расійскага імператара Мікалая І, як і шмат іншыя былыя каталіцкія святыні.

Паводле акварэлі Ю. Пешкі пачатку XIX ст. і абмераў 1830-х гг. будынак калегіума далучаўся да касцёла двухпавярховым уваходным аб’ёмам з асобным дахам, над якім узвышалася трох’ярусная гадзіннікавая вежа-званіца з высокім спічакам. У 1872 г. гэтую вежу цалкам разабралі. На малюнку Н. Орды яна адсутнічае, але вежы і купал былога касцёла яшчэ мелі фігурныя барочныя завершэнні-“банькі”, якія, паводле праекта 1841 г. губернскага архітэктара А. Порта, меркавалася замяніць на паўсферычныя. Гэты малюнак з’яўляецца бясспрэчным графічным дакументам, што ўдакладняе гісторыю помніка, які быў разбураны ў 1956 г. з мэтай “добраўпарадкавання і рэканструкцыі” цэнтра Віцебска, што прывяло да незваротных страт гістарычнай памяці і мастацкага аблічча гэтага старажытнага горада.

Рэзідэнцыі езуітаў звычайна размяшчаліся ў вялікіх па тым часе і старажытных гарадах, акрамя названых, у такіх як Гродна, Брэст, Мінск, Орша, Пінск, Магілёў, Бабруйск, Навагрудак, Ваўкавыск, Слуцк, але іншы раз, па запрашэнню ўладальнікаў, у прыватнаўласніцкіх мястэчках і нават вёсках, як напрыклад у Нясвіжы, Юравічах, Крывошыне, Блоні і інш. Вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць мае малюнак (мал. 6) Н. Орды 1877 г. [1, № 169]) з выявай езуіцкага касцёла ў вёсцы Фашчаўка (былы Горацкі павет, цяпер Шклоўскі раён Магілёўскай вобл.), які з’яўляецца адзінай выявай гэтага амаль зусім недаследаванага ў гісторыі айчыннай архітэктуры помніка і суправаджаецца надпісам: “Касцёл паезуіцкі, заложаны ў 1754 г. Ксёнз Галкевіч”. На адвароце дадаткова адзначана, што у касцёле знаходзіцца цудатворны абраз Маці Божай. Па іншых крыніцах, мястэчка Фашчаўка, што знаходзіцца за 11 км ад Шклова, належала князю А.Чартарыйскаму, які ў 1765 г. фундаваў тут місію езуітаў і мураваны касцёл у гонар Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. На малюнку Н. Орды буйным планам прадстаўлены прыгожы дзвюхвежавы трохнефавы храм з трансептам, роўнавысокім цэнтральнаму нефу, і з фігурнымі франтонамі на тарцах перакрыжаваных дахаў, узведзены ў стылі віленскага барока.

Чатырох’ярусныя вежы касцёла мелі надзвычай маляўнічыя барочныя завяршэнні. Характэрна, што скразныя праёмы для званоў знаходзіліся даволі нізка, на другім ярусе, а трэці ярус, на ўзроўні франтона, быў глухі. У цэнтры франтона галоўнага фасада размяшчалася паўкруглая ніша-табернакула з скульптурнай выявай Дзевы Марыі. За алтарнай часткай касцёла бачны аднапавярховыя мураваныя будынкі місіі езуітаў, накрытыя вальмавымі дахамі. Тэрыторыя комплекса акружана драўлянай агароджай з

бярвенняў “у шулах” са сціплай брамкай-“веснічкай”, што падкрэслівае незвычайнасць размешчэння місіі гэтага арыстакратычнага ордэна ў глыбокай правінцыі. З 1876 г. касцёл стаў парафіяльным і набажэнствы ў ім вяліся на беларускай мове. Разбураны ў 1930-я гг., на сённяшні дзень ад яго не засталося ніякіх слядоў.



**Малюнак 6 – Фашчаўка. Касцёл езуітаў**

Панарама гістарычнага цэнтра горада Сянно, раней павятовага мястэчка Магілёўскай губерніі, цяпер райцэнтра Віцебскай вобласці, намалявана Н. Ордам 30 ліпеня 1877 г. (мал. 7). Надпіс на малюнку − Sienna [1, № 642], на ім прадстаўлены каштоўны і малавядомы помнік сакральнай архітэктуры позняга беларускага барока − касцёл св. Фартуната, а разам з тым праваслаўная царква Св. Тройцы з трыма купаламі. Касцёл размяшчаўся на беразе возера Сянно каля замка бастыённага тыпу, узведзенага ўладальнікам мястэчка канцлерам Вялікага Княства Літоўскага Львом Сапегам. Ён жа ў 1613 г. асадзіў тут манахаў жабрацкага ордэна францысканцаў і заснаваў 4-класнае вучылішча для бедных. Мураваны касцёл пабудаваны ў другой палове XVIII ст., да 1772 г. (вядома, што ў гэтым годзе сюды з Рыма прывезлі мошчы св. Фартуната, у гонар якога кансэкравалі святыню). Велічная прамавугольная ў плане трохнефавая базіліка з трансептам, роўнавысокім цэнтральнаму нефу, утварала ў верхнім сячэнні лацінскі крыж. Алтарная частка мела прамавугольны абрыс. Тарцы перакрыжаваных двухсхільных дахаў завершаліся высокімі трохвугольнымі франтонамі. Са сціпласцю і лапідарнасцю агульнай кампазіцыі, уласцівай будаўніцтву францысканцаў, кантраставаў пышны галоўны фасад з вылучанай цэнтральнай часткай і дынамічнай групоўкай калон, які выступаў крыху за межы базілікі. Касцёл францысканцаў у Сянно быў часткова разбураны ў гады Другой сусветнай вайны, а затым канчаткова варварскі знішчаны ўжо падчас так званай “хрушчоўскай адлігі”, якая зусім не была адлігай у гістарычнай памяці беларускага народа.



**Малюнак 7 – Сянно. Панарама мястэчка з касцёлам францысканцаў**

На наступны дзень, 31 ліпеня 1877 г., Н. Орда быў ужо ў Аршанскім павеце, непадалёку ад Сянно, і зрабіў замалёўку мястэчка Смаляны з боку рэчкі Дзярноўкі [1, № 666]. На малюнку (мал. 8), зробленым, як звычайна, алоўкам і злёгку падмаляваным акварэллю, справа прадстаўлены руіны вежы замка, пабудаванага ў стылі паўночнага рэнесанса каля 1626 г. князем С. Сангушкам-Ковельскім (у Кракаўскім каталозе малюнкаў Н. Орды ён недакладна атрыбутаваны як замак каралевы Боны − *Т. Г.*). У цэнтры бачны прыгожы касцёл з дзвюма стромкімі вежамі ў стылі віленскага барока, у далечыні справа ад яго − драўляная Спаса-Праабражэнская царква XVIII ст., злева − высокі груваздкі ламаны дах сінагогі. Касцёл Звеставання Дзевы Марыі належаў вельмі пашыранаму на Беларусі жабрацкаму прапаведніцкаму ордэну дамініканцаў, які з'явіўся тут у 1678 г. па запрашэнню тагачаснага ўладальніка мястэчка князя Гераніма Сангушкі [8, спр. 1977]. Прыгожая мураваная трохнефавая базіліка з трансептам, які выяўлены толькі ў верхнім сячэнні збудавання, узведзена самімі манахамі-дамініканцамі пад кіраўніцтвам Людвіка Грынцэвіча, які, як вядома, навучаўся архітэктуры ў Італіі. Лацінскі крыж, утвораны дахамі цэнтральнага нефа і трансепта, падкрэслены фігурнымі франтонамі на галоўным і бакавых фасадах. Кляштар зачынены пасля паўстання, у 1832 г., святыня больш за стагоддзе знаходзіцца ў заняпадзе і паступова разбураецца.



**Малюнак 8 – Смаляны. Панарама мястэчка з касцёлам дамініканцаў**

Свядомая праграма замалёвак Н. Орды архітэктурных краявідаў Айчыны была накіравана на фіксацыю гісторыка-культурнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага ў яго гістарычных дзяржаўных межах, амаль праз 100 гадоў пасля знікнення краіны з карты Еўропы, пасля вызваленчых паўстанняў 1830−1831 і 1863−1864 гг., якія вызначылі ўласны лёс мастака і лёс яго сяброў. Створаныя ім мастацкія творы фіксуюць ужо іншы час і рамантычны погляд на мінулае. Мы аддалены ад таго часу цэлым XX ст., поўным сацыяльных катастроф, войнаў і рэвалюцый, варожага стаўлення да рэлігіі і нацыянальнай культуры, што прывялі да далейшага руйнавання вялікай колькасці помнікаў айчыннага дойлідства. У малюнках Н. Орды помнікам дойлідства нібыта надаецца другое жыццё. Мастак-патрыёт імкнуўся данесці і данёс да нашчадкаў, паводле яго ўласнага выказвання, "рэшткі нашай славы і цывілізацыі".

ЛІТАРАТУРА

1. Katalog rysunków architektonicznych ze zbiorów Muzeum Narodowego w Krakowie. – Warszawa : PWN, 1975. – T. I. Rysunki Napoleona Ordy.
2. Левандаускас, В. Иконографические особенности творчества Наполеона Орды / В. Левандаускас // Веснік Бел. дзярж. ун-та культуры і мастацтва. – 2004.
3. Габрусь, Т.В. Помнікі сакральнай архітэктуры Беларусі ў малюнках Напалеона Орды / Т.В.Габрусь // Архітэктурная спадчына Беларусі: канстанта памяці : Мірскія навук. чытанні, Мір, 2007. – С. 69–99.
4. Габрусь, Т.В. Паэзія архітэктуры / Т.В.Габрусь. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – С. 217–231.
5. Габрусь, Т. Рэшткі нашай славы і цывілізацыі / Т.Габрусь // Наша вера. – 2009. – №1 (47). – С. 50–55.
6. Святы Андрэй Баболя. – Мінск : Про Хрысто, 1994.
7. Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя. – Мінск : Ураджай, 2001. – 144 с.
8. Навуковая бібліятэка Вільнюскага ўніверсітэта // Аддзел рукапісаў. – Вільнюс.